УДК 070.19

Студ. А.С. Янучок
Навук. кір. дац. А.А. Кірдун
(кафедра беларускай філалогіі, БДТУ)

# ПАЗІТЫЎНАЯ І НЕГАТЫЎНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ НА БЕЛАРУСКІХ САЙТАХ НАВІН

Сёння СМІ часта вінавацяць у тым, што яны навязваюць сваёй аўдыторыі негатыўны парадак дня. Як сцвярджаюць даследчыкі, адна з прычын, па якой негатыўныя навіны хвалююць у большай ступені, звязана з тым, што большасць людзей з'яўляюцца памяркоўнымі аптымістамі [2, с. 33]. Чалавек ацэньвае навізну паведамленняў адносна базавай кропкі, і ўсярэдненая негатыўная інфармацыя звычайна аказваецца далей ад яе, чым усярэдненая пазітыўная. Адпаведна, і цікавасць да яе вышэй. Журналісты і рэдактары адчуваюць павышаную ўвагу аўдыторыі да такіх тэм і імкнуцца задаволіць гэты попыт.

Зацікавіўшыся апісанай праблемай, мы вырашылі правесці ўласнае даследаванне з мэтай высвятлення суадносін пазітыўнай і негатыўнай інфармацыі на беларускіх навінных сайтах. Аб'ектам даследавання абраны загалоўкі артыкулаў: менавіта гэтыя элементы тэксту (загалоўкі) займаючы стылістычна моцную пазіцыю нясуць інфармацыю пра змест усяго артыкула і ацэнку падзеі аўтарам. Людзі рэдка прачытваюць тэкст цалкам. Па словах псіхолагаў, 80% чытачоў надаюць увагу толькі загалоўкам [3, с. 143].

Аналіз загалоўкаў рускамоўных артыкулаў газеты “Рэспубліка” (https://www.sb.by/respublika/archive/01102019/) паказвае, што 93 % ад іх агульнай колькасці змяшчаюць нейтральную або пазітыўную інфармацыю: аб сустрэчах палітыкаў, перамогах беларусаў у міжнародных і рэспубліканскіх мерапрыемствах, тэхналагічных дасягненнях у краіне, падрыхтоўцы арганізацый і прадпрыемстваў да зімы і інш. (“Рельсы в будущее”, “Испытание на прочность”, “Чистые помыслы”, “Мамино счастье” і інш.). 7 % рускамоўных загалоўкаў паведамляюць аб негатыўных з'явах ці падзеях: аб крадзяжы, забойстве, дрэннай псіхалагічнай абстаноўцы ў сям'і і г. д. (“Крест на качестве”, “Бой с серой тенью”, “Отношения, отравленные ядом”, “Бедные не плачут?”, “Семейная лодка разбилась о тренд”).

Загалоўкі беларускамоўных атыкулаў, размешчаных у кастрычніку 2019 года ў газеце “Рэспубліка”, таксама падзяляюцца на дзве групы: 75 % ад іх агульнай колькасці змяшчаюць нейтральную або пазітыўную інфармацыю, а 25% – негатыўную.

Такім чынам, наш аналіз паказвае, што ў кастрычніку 2019 года чытачам газеты “Рэспубліка” негатыўная інфармацыя часцей

паведамлялася на беларускай мове. Аднак калі на рускай мове паведамлялася аб “мясцовых” здарэннях, то беларускамоўныя артыкулы расказваюць пра розныя замежныя падзеі: ваенныя сутыкненні, акцыі пратэсту, праблемы міграцыі, анамаліі надвор’я, злачынствы ў інтэрнэце (“Хагібіс” жартаваць не любіць”, “Пратэст сышоў на нішто”, “Баявы НЛА”, “Гарачая арабская восень”, “Тэст на ДНК для мігрантаў”, “Дым нельга схаваць”).

Аналагічнае даследаванне мы правялі і на матэрыяле навін, размешчаных 02.03.2020 на трох беларускіх інтэрнэт-рэсурсах: Newsbel.by, Tut.by, Naviny.by. У выніку прыходзім да высновы, што ў адрозненне ад газетнага кантэнту, на інтэрнэт-рэсурсах доля негатыўнай інфармацыі значна большая – яна складае ад 40 да 60 %. У прыватнасці, 02.03.2020 гэты працэнт склалі паведамленні аб дарожна-транспартных здарэннях, знойдзеным у рацэ трупе, спробе абрабавання банка, калецтве падчас сваркі ў нецвярозым стане, аб выпадках каранавірусу, аб распаўсюджванні фэйкавай інфармацыі, розных трагічных здарэннях.

Такім чынам, сёння з моманту, калі адбылася падзея, і да моманту, калі інфармацыя пра яе з’явілася на старонцы навіннага сайта, праходзіць усяго некалькі хвілін. Журналісты імкнуцца паспець першымі паведаміць у сетцы аб важнай падзеі. «Хуткасць дазваляе павялічыць наведвальнасць рэсурсу, а значыць, яго рэйтынг. У адрозненне ад газеты, пастаянна абнаўляемы сайт не мае дэдлайну. Ці, можна сказаць, у яго штохвілінна, штосекундна дэдлайн. … Навіна ў сетцы з’яўляецца імгненна. Пасля таго, як яна напісана, застаецца толькі размясціць яе на сайце, а гэта справа лічаных секунд. Адразу ж пасля гэтага навіна з’яўляецца ў акаўнтах у сацыяльных медыя і становіцца ўсеагульным здабыткам» [1, с. 28]. Зразумела, што СМІ не могуць ігнараваць патрэбы аўдыторыі, для якой працуюць. Аднак, на наш погляд, журналісты павінны разумець, што на іх ляжыць адказнасць за стварэнне пэўных настрояў у грамадстве.

ЛІТАРАТУРА

1. Градюшко, А.А. Современная веб-журналистика Беларуси / А.А. Градюшко. – Минск : БГУ, 2013. – 179 с.

2. Колезев, Д.Е. Негативный уклон: почему интернет-СМИ так много пишут о плохом [Электронны рэсурс] / Д.Е. Колезев // Рэжым доступу: http://elar.urfu.ru/bitstream/10995/61216/1/978-5-7996-2403-3_10.pdf (дата звароту 05.12.2019).

3. Шишкин, Н.Э. Газетный заголовок / Н.Э. Шишкин. – М. : ТюмГУ, 2004. – 51 с.